ДУА «Мінскі абласны інстытут развіцця адукацыі»
вучэбна-метадычны аддзел дашкольнай і пачатковай адукацыі

РЭКАМЕНДАЦЫІ
па арганізацыі штотыднёвай тэматычнай акцыі «Скарбонка роднага слова» і тэматычных літаратурных дзён ва ўстановах дашкольнай адукацыі Мінскай вобласці

У мэтах выканання рэкамендацый, дадзеных Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь у пісьме ад 10.09.2026 № 02-01-11/10507/дс/, прапануем арганізаваць ва ўстановах дашкольнай адукацыі Мінскай вобласці правядзенне штотыднёвай тэматычнай акцыі «**Скарбонка роднага слова**».

Ва ўстановах дашкольнай адукацыі з рускай мовай навучання, дзе ажыццяўляецца практыка арганізацыі беларускамоўнага дня з удзелам дзяцей і бацькоў другой малодшай, сярэдняй і старшай груп, прапануецца штотыднёва ў гэты дзень праводзіць тэматычную акцыю, што забяспечыць магчымасць пашырэння зместу работы падчас арганізацыі нерэгламентаванай дзейнасці.

Ва ўстановах з рускай мовай навучання, дзе спынена практыка арганізацыі беларускамоўнага дня з удзелам дзяцей і бацькоў і пашырана практыка арганізацыі зносін і чытання мастацкіх твораў на беларускай мове на працягу тыдня, прапануецца праводзіць акцыю ў той дзень, калі запланавана правядзенне заняткаў па адукацыйнай галіне «Развіццё маўлення і культура маўленчых зносін».

Ва ўстановах дашкольнай адукацыі з беларускай мовай навучання дадзеная тэматычная акцыя плануецца і праводзіцца ў адзін з дней тыдня ў межах нерэгламентаванай дзейнасці.

Галоўнае патрабаванне: акцыі ва ўсіх установах раёна (горада) павінны праводзіцца ў адзіны дзень тыдня.

Змест работы выхавальніка з выхаванцамі падчас правядзення тэматычнай акцыі «Скарбонка роднага слова» павінен прадугледжваць знаёмства дзяцей з беларускімі словамі, тлумачэнне іх значэння, арганізацыю розных відаў мастацкай і гульнявой дзейнасці з апорай на гэтыя словы (дадатак 1). Дазваляецца дадаткова выкарыстоўваць іншыя гульні і заданні.

Прапануем штотыднёва ўводзіць у актыўны слоўнік выхаванцаў другой малодшай групы адно слова, сярэдняй групы – два словы, старшай групы – тры словы ў адпаведнасці з каляндарна-тэматычным планаваннем, якое реалізуецца ва ўстановах дашкольнай адукацыі вобласці (дадатак 2).

Тэматычныя літаратурныя дні, падчас правядзення якіх асновай адукацыйнага працэсу становіцца чытанне і абмеркаванне твораў, гульні-драматызацыі, тэатральныя пастановы, прапануецца праводзіць штодня на канікулах; на «кароткіх» тыднях, калі заканчваецца адзін месяц і пачынаецца другі; 21 лютага ў Міжнародны дзень роднай мовы (дадатак 3). Дадаткова прапануецца праводзіць тэматычныя літаратурныя дні, прымеркаваныя да юбілейных дат з дня нараджэння беларускіх пісьменнікаў і паэтаў – аўтараў твораў для дзяцей дашкольнага ўзросту (дадатак 4).

Прапануецца збіраць матэрыялы, распрацаваныя падчас арганізацыі штотыднёвай акцыі і тэматычных літаратурых дзён ва ўстановах адукацыі:

1) сцэнарыі тэматычных дзён;
2) канспекты заняткаў па адукацыйнай галіне «Мастацкая літаратура»;
3) мастацкія творы на беларускай мове, пытанні да гутаркі па зместу твора;
4) дыдактычны матэрыял для арганізацыі настольных дыдактычных гульняў «Складзі карцінку», «Лато» і інш;
5) інтэрактыўныя практыкаванні і гульні, створаныя з дапамогай адукацыйнага сервісу LearningApps;
6) відэаролікі з разважаннямі дзяцей і бацькоў аб значэнні слова #МоўныЛанцужок2026 (#МоўныЛанцужок2027);
7) запісы наіўных дзіцячых трактовак беларускіх слоў і адказаў на пытанні па казках (для стварэння зборніка);
8) аўдыязапісы чытання дзецьмі любімых беларускіх вершаў, распавядання беларускіх народных казак.

Распаўсюджванне вынікаў арганізацыі штотыднёвай акцыі «Скарбонка роднага слова» прапануецца ажыццяўляць, шляхам змяшчэння калажоў з фотаматэрыяламі і кароткай інфармацыяй, відэаролікаў з разважаннямі дзяцей на сайтах устаноў дашкольнай адукацыі ў раздзеле «Расцім маленькіх патрыётаў» («Растим маленьких патриотов»).

З мэтай забеспячэння доступу да матэрыялаў устаноў дашкольнай адукацыі на ўзроўні раёна прапануецца стварыць інтэрактыўны плакат, размясціць на бакавой панэлі сайта ўпраўлення (аддзела) адукацыі ці раённага метадычнага кабінета (цэнтра) іконку «Скарбонка роднага слова» са спасылкай на яго.

На ўзроўні вобласці матэрыялы таксама будуць аб'яднаны ў фармаце інтэрактыўнага плаката, спасылка на які будзе размешчана на сайце ДУА «Мінскі абласны інстытут развіцця адукацыі» і ў лічбавым адукацыйным кантэнце «ПРОпедагогов».

Распаўсюджванне вопыту арганізацыі тэматычных літаратурных дзён прапануецца ажыццяўляць на сайтах устаноў дашкольнай адукацыі шляхам размяшчэння інфармацыі ў раздзеле «Навіны» («Новости»).

У фінале прапануецца стварэнне зборнікаў:

на ўзроўні раёнаў і г. Жодзіна – «Літаратурная скарбонка» (лепшыя сцэнарыі тэматычных літаратурных дзён);

на ўзроўні ўстаноў адукацыі – «Моўны ланцужок: ад сэрца да сэрца» (запісы наіўных дзіцячых трактовак беларускіх слоў і адказаў на пытанні па беларускіх казках).

Дадатак 1

Ідэі для гульнявога і мастацкага ўвасаблення

Форма работы	Другая малодшая група	Сярэдняя група	Старшая група
Дыдактычныя гульні	**1. «Складзі карцінку і назаві слова» (разразныя карцінкі)** **Мэта** – замацоўваць у актыўным слоўніку назвы слоў на беларускай мове; развіваць дробную маторыку пальцаў рук падчас складання карцінкі. **Ход гульні**: дзеці атрымліваюць канверты з разразнымі карцінкамі, складваюць карцінку і называюць слова.	**1. «Пазнай, назаві і схавай!» (лато)** **Мэта** – замацоўваць у актыўным слоўніку назвы слоў на беларускай мове. **Ход гульні**: вядучы паказвае карцінку з выявай слова, пытаецца: «Што гэта?», «У каго гэта ёсць?». Дзеці знаходзяць выяву гэтага слова на гульнявым полі, адказваюць на пытанні (прагаворваюць слова) і закрываюць карцінку фішкай. *Даведкава. Падчас увядзення ў слоўнікавы запас новых слоў на беларускай мове гульнявое поле дапаўняецца выявамі новых слоў.* **2. «Скажы па-беларуску» (гульня з мячом)** **Мэта** – замацоўваць уменне называць на беларускай мове словы, якія вядучы называе на рускай мове. **Ход гульні:** вядучы называе слова на рускай мове і кідае мяч удзельніку гульні, той вымаўляе слова па-беларуску і кідае мяч вядучаму. *Даведкава. У гульні выкарыстоўваюцца словы, якія былі раней уведзены ў слоўнікавы запас дзяцей.*	1. **«Збяром беларускія словы ў скарбонку» (слоўнікавая дыдактычная гульня)** **Мэта** – замацоўваць уменне самастойна выкарыстоўваць у маўленні беларускія словы. **Ход гульні**: дзецям раздаюцца фішкі і прапануецца па чарзе называць беларускія словы; назваўшы слова, дзіця кідае фішку ў мяшэчак, які трымае вядучы. У канцы гульні выяўляецца пераможца (той, хто хутчэй за ўсіх паклаў фішкі ў мяшэчак, назваўшы правільна беларускія словы). **2. «Адгадай слова» (слоўнікавая дыдактычная гульня)** **Мэта** – замацоўваць уменне самастойна выкарыстоўваць у маўленні беларускія словы. **Ход гульні**: вядучы дае апісанне (значэнне) слова, называе першы і апошні гук. Калі хтосьці адгадаў, то атрымлівае фішку. У канцы гульні выяўляецца пераможца (варыянт: той, хто атрымлівае фішку, становіцца вядучым). **3. «Скажы па-беларуску» (гульня з мячом)**

			Мэта – замацоўваць уменне называць на беларускай мове словы, якія вядучы назвае на рускай мове. **Ход гульні:** вядучы называе слова на рускай мове і кідае мяч удзельніку гульні, той вымаўляе слова па-беларуску і кідае мяч вядучаму.
Мастацкая дзейнасць	**Размалюй… (праца ў размалёўках з выявамі новых слоў)** **Мэта** – развіваць дробную маторыку пальцаў рук, замацоўваць уменне адказваць на пытанні на беларускай мове, ужываючы новае слова («Што ты намаляваў?», «Якога колеру…?»)	**«Намалюй (зляпі з пластыліну) як выглядае…» (маляванне /лепка)** **Мэта** – развіваць дробную маторыку пальцаў рук, замацоўваць уменне адказваць на пытанні на беларускай мове («Што ты намаляваў/зляпіў?», «Што ты ведаеш пра…?»). *Даведкава: выбар выяўленчых матэрыялаў па жаданні дзяцей.*	**Дзіцячы дызайн «**Ствараем альбом беларускіх слоў» **Мэта** – развіваць дробную маторыку пальцаў рук, замацоўваць уменне выкарыстоўваць у маўленні беларускія словы падчас сумеснай творчай дзейнасці. **Змест дзейнасці**: дзецям прапануецца размаляваць літары, з якіх складаецца новае слова; намаляваць і (ці) выразаць малюнак і наклеіць на аркуш з выявай літары, з якой пачынаецца слова. У канцы года ствараецца альбом.
Мастацка-моўная дзейнасць	**Чытанне мастацкіх твораў**, у якіх гаворыцца пра прадметы (узгадваюцца новыя беларускія словы), гутарка паводле зместу.	**Чытанне мастацкіх твораў**, у якіх гаворыцца пра прадметы (узгадваюцца новыя беларускія словы), гутарка паводле зместу. **Завучванне вершаў, хуткагаворак; складанне апісальных апавяданняў** пра прадмет (з апорай на наглядную мадэль), сказаў з новымі беларускімі словамі.	**Чытанне мастацкіх твораў**, у якіх гаворыцца пра прадметы (узгадваюцца новыя беларускія словы), гутарка паводле зместу. **Завучванне вершаў, хуткагаворак; складанне апісальных апавяданняў** пра прадмет (з апорай на наглядную мадэль), сказаў з новымі беларускімі словамі. **Складанне загадак, вершаў, казак пра прадметы** (узгадваюцца новыя беларускія словы)

Хатняе заданне для бацькоў і дзяцей	**1, 3 тыдзень** – паслухайце казку і адкажыце на пытанні (прапануецца QR-код на аўдыязапіс і пытанні да размовы пасля праслухоўвання); **2, 4 тыдзень** – знайдзі і абвядзі кружком (даецца ліст з выявамі розных прадметаў, у тым ліку прадметы, з назвамі якіх дзеці толькі што пазнаёміліся; трэба іх знайсці, назваць і абвесці кружком)	**1, 3 тыдзень** – прачытайце разам мастацкі твор (прапануецца твор і пералік пытанняў па зместу твора); **2, 4 тыдзень** – пагуляйце разам (прапануецца QR-код ці спасылка на гульню, створаную з дапамогай адукацыйнага сервісу LearningApps)	**1 тыдзень** – прачытайце разам мастацкі твор (прапануецца твор і пералік пытанняў па зместу твора); **2 тыдзень** – адгадайце разам загадкі, намалюйце адгадкі (прапануюцца загадкі, дзеці прыносяць малюнкі-адгадкі); **3 тыдзень** – пагуляйце разам (прапануецца QR-код ці спасылка на гульню, створаную з дапамогай адукацыйнага сервісу LearningApps); **4 тыдзень** – заданне-даследаванне: «Спытайце ў дарослых (таты, бабулі, дзядулі, суседзяў): “Што такое…?”» (прапануецца атрымаць аўдыязапіс тлумачэння)

Дадатак 2

Паслядоўнаць увядзення ў актыўны слоўнік дзяцей беларускіх слоў з улікам каляндарна-тэматычнага планавання

Месяц	Тыдзень	Другая малодшая група		Сярэдняя група		Старшая група	
		Тэма тыдня	**Слова тыдня**	***Тэма тыдня***	**Слова тыдня**	***Тэма тыдня***	**Слова тыдня**
верасень	1	***«Дзіцячы сад»*** *(«Детский сад»)*	**цацкі**	***«Тыдзень кнігі»*** *(«Книжная неделя»)*	**пісьменнік чытач**	***«У госці да кніг»*** *(«В гости к книге»)*	**байка апавяданне твор**
	2	***«Свет прафеій (прафесіі ў дзіцячым садзе: выхавальнік, памочнік выхавальніка, кухар»*** *(«Мир профессий (профессии в детском саду: воспитатель, помощник воспитателя, повар)»)*	**кухар**	***«Мой горад, вёска, аграгарадок»*** *(«Мой город (деревня, агрогородок)»)*	**будынак дах**	***«Я, ты, ён, яна – разам цэлая краіна!»*** *(«Я, ты, он, она – вместе целая страна!»)*	**краіна дзяржава сцяг**
	3	***«Восень»*** *(«Осень»)*	**гародніна**	***«Рознакаляровая восень»*** *(«Разноцветная осень»)*	**непагадзь парасон**	***«Восеньскі калейдаскоп»*** *(«Осенний калейдоскоп»)*	**верасень кастрычнік лістапад**

	4	***«Агарод, агародніна»*** *(«Во саду ли, в огороде (овощи)»)*	**цыбуля**	***«Азбука здароўя»*** *(«Азбука здоровья»)*	**хвароба** **дрыжыкі**	***«Што восенню збярэш, тое зімой знойдзеш»*** *(«Что осенью соберешь, то зимой на столе найдешь»)*	**бручка** **ляшчына** **сховішча**
кастрычнік	1	***«Я – чалавек»*** *(«Я – человек»)*	**вока**	***«Прадукты харчавання»*** *(«Продукты питания»)*	**кава** **гарбата**	***«Сакрэты здароўя»*** *(«Секреты здоровья»)*	**пастава** **страўнік** **ныркі**
	2	***«Мая матуля»*** *(«Мамочка любимая»)*	**клопат**	***«Усе мы розныя»*** *(«Все мы разные»)*	**стары** **дзіця**	***«Як мы робім пакупкі»*** *(«Как мы делаем покупки»)*	**чарга** **торба** **рэшта**
	3	***«Сям'я»*** *(«Семья»)*	**матуля**	***«Мая сям'я»*** *(«Моя семья»)*	**бацькі** **сваякі**	***«Мая дружная сям'я»*** *(«Моя дружная семья»)*	**продкі** **нашчадкі** **радавод**
	4	***«Добра – дрэнна: правілы паводзін»*** *(«Что такое хорошо и что такое плохо»)*	**ветлівасць**	***«Мой дом»*** *(«Мой дом»)*	**падлога** **столь**	***«Тайны лесу»*** *(«Тайны леса»)*	**яліна** **зязюля** **гушчар**
лістапад	1	***«Прадметы вакол нас (колер, форма, велічыня)»*** *(«Мир предметов (цвет, форма, величина)»)*	**колер**	***«Прадметы рукатворнага свету»*** *(«Предметы рукотворного мира»)*	**відэлец** **шыба**	***«Берагоша ідзе ў госці да дзяцей»*** *(«Берегоша в гостях у ребят»)*	**багацце** **дабрабыт** **кошт**
	2	***«Прадметы вакол нас (цацкі)»*** *(«Мир предметов*	**бразгаўка**	***«Адзенне і абутак»*** *(«Наш гардероб»)*	**шкарпэткі** **чаравікі**	***«Такая розная ежа»*** *(«Такая разная еда,*	**страва** **бабка** **смак**

		(игрушки)»)				*что откуда и куда?»)*	
	3	***«Прадметы вакол нас (адзенне, абутак»)*** *«Мир предметов (одежда, обувь)»*	**кашуля**	***«Усё пра эканоміку»*** *(«Все об экономике»)*	**грошы праца**	***«Суседзі на планеце»*** *(«Соседи по планете»)*	**чужазе́мец / насе́льніцтва тутэйшы**
	4	***«Мой горад (вёска, аграгарадок)»*** *(«Мой город (село, деревня, агрогородок)»)*	**падворак**	***«Азбука бяспекі»*** *(«Азбука безопасности»)*	**незнаёмец кіпень**	***«Тэхніка на службе ў чалавека»*** *(«Техника на службе у человека»)*	**рухавік мікрахвалёўка помпа**
снежань	1	***«Пажарная бяспека»*** *(«Азбука безопасности (дома, пожарная)»)*	**ратавальнік**	***«Сябруюць дзеці на ўсей Зямлі»*** *(«Дружат дети всей Земли»)*	**шчырасць сяброўства**	***«Электрапрыборы дапамагаюць чалавеку»*** *(«Электроприборы помогают и труд наш облегчают!»)*	**пральная машина прас кавaварка**
	2	***«Зіма»*** *(«Зима»)*	**шэрань**	***«Прывітанне, зіма»*** *(«Здравствуй, зимушка-зима»)*	**завіруха ледзяш**	***«Зімовы калейдаскоп»*** *(«Зимний калейдоскоп»)*	**снежань студзень люты**
	3	***«Новы год»*** *(«Новый год»)*	**свята**	***«Навагодні калейдаскоп. Новы год»*** *(«Новогодний калейдоскоп. Новый год»)*	**падарунак паштоўка**	***«Новы год каля варот!»*** *(«Новый год у ворот!»)*	**калядоўшчык ліхтарыкі бліскаўкі**
	4	**Канікулы: замацаванне ў актыўным слоўніку беларускіх слоў сродкамі гульнявой і мастацкай дзейнасці.**					
ст	1	***«У свеце музыкі (музычныя***	**жалейка**	***«Зімовыя забавы»*** *(«Зимние забавы и*	**коўзанка фартэцыя**	***«Цудоўны свет мастацтва***	**палітра палатно**

		інструменты») *(«В мире музыки (музыкальные инструменты)»)*		*развлечения»)*		***(жывапіс і скульптура)»*** *«Волшебный мир искусства (живопись и скульптура)»*	**злепак**
	2	***«У свеце казак (фальклорныя творы)»*** *(«В мире сказок (фольклорные произведения)»)*	**лічылка**	***«Цудоўны мір тэатра»*** *(«Волшебный мир театра»)*	**квіток заслона**	***«Дзе жыве музыка?»*** *(«Где живет музыка?»)*	**спявак слухач кружэлка**
	3	***«Свет прыроды (хатнія жывёлы)»*** *(«Мир природы (домашние животные)»)*	**трус**	***«У свеце выяўленчага мастацтва»*** *(«В мире изобразительного искусства»)*	**аловак пэндзаль**	***«Тэатр адчыняе заслону»*** *(«Театр открывает занавес»)*	**зала глядач асвятляльнік**
	4	***«Свет прыроды (хатнія жывёлы)»*** *(«Мир природы (дикие животные)»)*	**дзік**	***«Куток прыроды»*** *(«Уголок природы»)*	**пеларгонія насенне**	***«Нашы лепшыя сябры, што жывуць у жывым кутку»*** *(«Наши лучшие друзья из живого уголка»)*	**слімак пацук напаўняльнік**
ЛЮТЫ	1	***«Свет прыроды (прыродным куток у дзіцячым садзе)»*** *(«Мир природы (уголок природы в детском саду)»)*	**кветка**	***«Маленькія эксперыментатары»*** *(«Маленькие экспериментаторы»)*	**шалі вадкасць**	***«Што такое добра і што такое дрэнна?»*** *(«Что такое хорошо и что такое плохо?»)*	**дапамога павага шкода**

	2	***«Прафесіі (урач, міліцыянер, пажарны)»*** *(«Мир профессий (врач, милиционер, пожарный)»)*	**лекар**	***«Цацкі»*** *(«Игрушки»)*	**гульнятэка** **некуляйка**	***«Родны свой край любі і ведай!»*** *(«Родной свой край люби и знай!»)*	**мястэчка** **землякі** **гонар**
	3	***«Нашы таты – лепш за ўсіх!»*** *(«Наши папы – лучше всех!»)*	**бацька**	***«Беларускае народнае мастацтва»*** *(«Белорусское народное творчество»)*	**выцінанка** **маляванка**	***«Дзе жывуць беларускія словы?»*** *(«Где живут белорусские слова?»)*	**сказ** **слоўнік** **мова**
	4	***«Транспарт»*** *(«Транспорт (профессия шофер)»)*	**кіроўца**	***«Нашы абаронцы»*** *(«Наши защитники»)*	**абаронца** **абавязак**	***«Хто абараняе Радзіму?»*** *(«Кто защищает Родину?»)*	**вайсковец** **абавязак** **трываласць**
сакавік	1	***«Хто шые адзенне?»*** *(«Мир профессий (швея)»)*	**крэйда**	***«Мамін дзень»*** *(«Мамин день»)*	**каханне** **прыгажосць**	***«Матуля каханая, мілая, родная»*** *(«Мамочка любимая, милая, родная»)*	**пяшчота** **падзяка** **шчырасць**
	2	***«Вясна»*** *(«Весна»)*	**кропля**	***«Вясна ідзе»*** *(«К нам весна шагает быстрыми шагами...»)*	**крыгаход** **промні**	***«Вясновы калейдаскоп»*** *(«Весенний калейдоскоп»)*	**сакавік** **красавік** **адліга**
	3	***«Народныя майстры»*** *(«Мастерство народных умельцев (декоративно-прикладное творчество)»)*	**выраб**	***«Свет жывёл»*** *(«Мир животных»)*	**вавёрка** **трус**	***«Дзе жывуць навіны?»*** *(«Где живут новости?»)*	**выдавецтва** **часо́піс** **даведка**

	4	**Канікулы: замацаванне ў актыўным слоўніку беларускіх слоў сродкамі гульнявой і мастацкай дзейнасці.**					
красавік	1	***«Свет прыроды (птушкі)»*** *«Мир природы (птицы)»*	**шпак**	***«Птушкі – нашы сябры»*** *(«Птицы – наши друзья»)*	**дзюба** **шпакоўня**	***«Адпраўляемся ў падарожжа»*** *(«Отправляемся в путешествие»)*	**заплечнік** **краявід** **шпацыр**
	2	***«Свет прыроды (расліны)»*** *«Мир природы (растения)»*	**дзьмухавец**	***«Дарожная азбука»*** *(«Дорожная азбука»)*	**прыпынак** **небяспека**	***«Паветраная і касмічная прастора»*** *(«Воздушное и космическое пространство»)*	**няважкасць** **сусвет** **сузор'е**
	3	***«Свет прыроды (нежывая прырода)»*** *(«Мир природы (неживая природа)»)*	**вясёлка**	***«Транспарт»*** *(«Транспорт»)*	**чыгунка** **цягнік**	***«Цікавае падарожжа на паўночны полюс (Арктыка)»*** *«Увлекательное путешествие в холодные страны на Северный полюс (Арктика)»*	**ледавік** **алька** **люрык**
	4	***«Прадметы вакол нас (мэбля, бытавая тэхніка)»*** *(«Мир предметов (мебель, бытовая техника)»)*	**канапа**	***«Горад майстроў»*** *(«Город мастеров»)*	**кірмаш** **каваль**	***«Дзівосны свет паўднёвых краін»*** *(«Удивительный мир жарких стран»)*	**малпа** **цытрына** **вусень**
май	1	***«Творы мастацкай літаратуры»*** *(«Книжкины забавы» (стихи, проза))*	**вокладка**	***«Прафесіі дарослых»*** *(«Профессии взрослых»)*	**настаўнік** **будаўнік**	***«Гэта зроблена ў Беларусі»*** *(«Это сделано в Беларуси»)*	**прадпрыемства** **гадзіннік** **цукеркі**

	2	***«Здароўе, асабістая гігіена»*** *(«Забота о нашем здоровье (личная гигиена)»)*	**грабянец**	***«Маленькі патрыёт сваёй каріны»*** *(«Маленький патриот своей страны»)*	**краіна** **бацькаўшчына**	***«Памятаем і ганарымся!»*** *(«Помним и гордимся!»)*	**помнік** **вызваліцель** **пераможца**
	3	***«Здароўе, здароўезберагальныя паводзіны»*** *(«Забота о нашем здоровье (культура поведения)»)*	**звычка**	***«Маленькія сябры прыроды»*** *(«Маленькие друзья природы»)*	**бэз** **язмін**	***«Каляровая палітра»*** *(«Цветочная палитра»)*	**руды** **бэзавы** **ружовы**
	4	***«Бяспека на дарозе»*** *(«Безопасность на дороге»)*	**скрыжаванне**	***«Тыдзень добрых спраў»*** *(«Неделя добрых дел»)*	**клапаціцца** **ратаваць**	***«Школа»*** *(«Школа, школа, мы готовы!»)*	**адзнака** **сшытак** **падручнік**
чэрвень	1	***«Мае аднагодкі: жывем і сябруем разам!»*** *(«Будем жить дружно!»)*	**сябар**	***«Добра ў нашым дзіцячым садзе»*** *(«Хорошо у нас в саду»)*	**аднагодкі** **прозвішча**	***«Сябруюць дзеці на планеце»*** *(«Дружат дети всей планеты»)*	**сустрэча** **сябар / сяброўка** **парада**
	2	***«Лета»*** *(«Лето»)*	**навальніца**	***«Рада лету дзетвара!»*** *(«Рада лету детвора!»)*	**сенажаць** **зёлкі**	***«Лета крочыць па планеце»*** *(«Лето шагает по планете»)*	**чэрвень** **ліпень** **жнівень**
	3	***«Лета: здароўе і бяспека»*** *(«Здоровье и безопасность летом»)*	**спякота**	***«Бяспечнае лета»*** *(«Безопасное лето»)*	**плынь** **багна**	***«У што гуляюць дзеці?»*** *(«Во что играют дети?»)*	**хованкі** **арэлі** **квач**
	4	***«Свет прыроды (насякомыя)»*** *(«Мир природы*	**конік**	***«Расліны вакол нас»*** *(«Растения вокруг нас»)*	**пялёстак** **сцябло**	***«У садзе, на агародзе»*** *(«Во саду*	**трускаўка** **кошык** **прысады**

		(насекомые) »)				*ли, в огороде?»)*	
ліпень	1	***«Мы – маленькія беларусы»*** *(«Мы – маленькие белорусы»)*	**верш**	***«Мая Радзіма – Беларусь»*** *(«Моя Родина – Беларусь»)*	**дзяржава** **незалежнасць**	***«Вось мой дом, я тут жыву, вам пра гэта раскажу»*** *(«Вот мой дом, я здесь живу, вам про это расскажу!»)*	**незалежнасць** **урачыстасць** **помнік**
	2	***«Мы – маленькія даследчыкі»*** *(«Мы – маленькие исследователи»)*	**даследчык**	***«У госці да Берагошы»*** *(«В гостях у Берегоши»)*	**лічыльнік** **дбайнасць**	***«Па старонках Чырвонай кнігі»*** *(«По страницам Красной книги»)*	**мядзянка** **стронга** **пугач**
	3	***«Кветкі на нашай клумбе»*** *(«Что растет на клумбе»)*	**парастак**	***«Спартыўнае лета»*** *(«Спортивное лето»)*	**вынік** **рух**	***«Незвычайнае падарожжа ў падводны свет»*** *(«Необычное путешествие в подводный мир»)*	**хваля** **шчупак** **мянтуз**
	4	***«Мы – маленькія эколагі»*** *(«Мы – маленькие экологи»)*	**казуркі**	***«У свеце выяўленчага мастацтва»*** *(«В мире изобразительного искусства»)*	**дойлідства** **палатно**	***«Мы на луг хадзілі»*** *(«Мы на луг ходили»)*	**канюшына** **траскун** **матылёк**
жнівень	1	***«Мы – маленькія кнігалюбы»*** *(«Мы – маленькие книголюбы»)*	**кнігарня**	***«Святочны карнавал»*** *(«Сказочный карнавал»)*	**цмок** **чарадзей**	***«Ад зярнятка да каравая!»*** *(«От зернышка – до каравая!»)*	**ралля** **жніво** **скібка**
	2	***«Свет гульні і цацак»*** *(«Мир игр и*	**ваўчок**	***«Падарожжа па Беларусі»*** *(«Путешествие по*	**вандроўнік** **падарожжа**	***«Што нам варта дом пабудаваць?»*** *(«Что нам стоит*	**цясляр** **зруб** **цэгла**

		игрушек»)		*Беларуси»)*		*дом построить?»)*	
	3	***«Мы – маленькія фантазёры»*** *(«Мы – маленькие фантазеры»)*	**цуд**	***«Вось мы якія»*** *(«Вот мы какие»)*	**твар** **вусны**	***«Надзвычайная лабараторыя»*** *(«Удивительная лаборатория»)*	**вапняк** **смарагд** **крэйда**
	4	***«Вось і лета мінула»*** *(«Вот и лето прошло»)*	**вырай**	***«Вось і лета мінула»*** *(«Вот и лето прошло»)*	**раніца**	***«Як кашуля ў полі вырастала»*** *(«Как рубашка в поле выросла»)*	**кудзеля** **кашуля** **каўнер**

Даведачна. Пералік слоў прапанаваны згодна тэмам, прадстаўленым у дапаможніку «Сучасныя падыходы да планавання адукацыйнага працэсу ва ўстанове дашкольнай адукацыі» (Современные подходы к планированию образовательного процесса в учреждении дошкольного образования / сост. О. И. Шатило ; ГУО «Мин. обл ин-т развития образования». – Минск : Мин. обл. ин-т развития образования, 2024. – 144 с.). Дазваляецца ўводзіць у актыўны слоўнік іншыя беларускія словы ў адпаведнасці з тэмай тыдня.

Дадатак 3

Прыкладны план правядзення ва ўстановах дашкольнай адукацыі тэматычных літаратурных дзён 2026/2027 навучальны год

Месяц	Тыдзень	Тэматычны літаратурны дзень
верасень кастрычнік	**28.09.2026 – 02.10.2026**	Тэматычны літаратурны дзень па творах Эдзі Агняцвет Тэматычны літаратурны дзень па творах Івана Муравейкі
лістапад	**30.11.2026 – 04.12.2026**	Тэматычны літаратурны дзень па творах Якуба Коласа
снежань студзень	**Зімовыя канікулы** **25.12.2026 – 03.01.2026**	1. Дзень беларускіх народных традыцый і святаў 2. Дзень беларускіх народных гульняў 3. Дзень беларускай народнай музыкі 4. Дзень беларускіх народных страў 5. Дзень беларускага народнага касцюма
люты	**21.02. 2027**	Міжнародны дзень роднай мовы
сакавік	**Вясновыя канікулы** **29.03. 2027– 02. 04.2027**	1. Дзень казкі 2. Дзень паэзіі і калыханак 3. Дзень апавяданняў 4. Дзень беларускіх песень 5. Дзень беларускіх танцаў
чэрвень ліпень	**28.06.2027 – 02.07.2027**	Тэматычны літаратурны дзень па творах Янкі Купалы
жнівень	**30.08.2027 – 31.08.2027**	Тэматычны літаратурны дзень па творах Янкі Брыля Тэматычны літаратурны дзень па творах Пімена Панчанкі

Дататак 4

Каляндар юбілейных дат са дня нараджэння вядомых беларускіх паэтаў і пісьменнікаў, творы якіх прапануюцца для азнаямлення выхаванцаў устаноў дашкольнай адукацыі

2026/2027 навучальны год

№ п/п	Дата	Беларускі дзіцячы паэт, пісьменнік	Юбілейная дата са дня нараджэння	Творы згодна зместу вучэбнай праграмы дашкольнай адукацыі	Дадатковы спіс твораў
1	11 кастрычніка 2026 года	**Эдзі Агняцвет**, беларуская паэтэса, пісьменніца, перакладчыца	110 гадоў	**Другая малодшая група (выхаванцы ад 3 да 4 гадоў):** Э. Агняцвет «Маме» **Сярэдняя група (выхаванцы ад 4 да 5 гадоў):** Э. Агняцвет «Зямля з блакітнымі вачамі», «Маме» **Старшая группа (выхаванцы ад 5 да 6 гадоў):** Э. Агняцвет «Саўка за сталом», «Зямля з блакітнымі вачамі», «Хто пачынае дзень?»	**Вершы:** «Маме» («Калі б магла вясёлку з неба зняць...») – пра любоў да матулі; «Саўка за сталом» – пра паводзіны ў час ежы; «Вельмі "ветлівы" Мікіта» – пра ветлівасць; «Бульба ў кажушку» – пра бульбу ў мундзірах; «Ледзянцы» – пра паводзіны дзяцей на канцэрце; «Гульні-прыдумкі» – пра тое, як дзеці малююць вясновыя з'явы. **Зборнікі вершаў:** «Васількі», «Мой сябра», «Хто пачынае дзень?»
2	21 кастрычніка 2026 года	**Іван Муравейка**, беларускі дзіцячы пісьменнік, паэт, празаік, журналіст	105 гадоў	**Сярэдняя група (выхаванцы ад 4 да 5 гадоў):** І. Муравейка «Адмарозіў лапкі» **Старшая группа (выхаванцы ад 5 да 6 гадоў):** І. Муравейка «Акраец хлеба»	**Кароткія гульнявыя вершы і казкі:** «Кошка і мышка» – казка-верш пра тое, як кошка і мышка пасябравалі; «Алесь» – верш пра хлопчыка, які гуляе з мячом; «Восенню ў садзе» – пра тое,

					як хлопчык хацеў дастаць яблыкі з дрэва, а ветрык яму дапамог; «Жмуркі з коткай Муркай» – верш пра хатніх жывёл; «Андрэйка» – забаўны выпадак пра тое, як куры адабралі ў хлопчыка хлеб. **Зборнікі для сямейнага чытання:** «Вось якія мы», «Сняжынкі-смяшынкі», «Сем колераў вясёлкі».
3	9 студзеня 2026 года	**Максім Багдановіч**, беларускі паэт, публіцыст, літаратуразнаўца, перакладчык	135 гадоў	**Старшая група (выхаванцы ад 5 да 6 гадоў):** М. Багдановіч «Зімой»	**Казкі і вершы:** «Мушка-зелянушка і камарык – насаты тварык» – вершаваная казка; «Зіма» («Здароў, марозны, звонкі вечар...») – верш пра зімовыя выявы.
4	7 ліпеня 2027 года	**Янка Купала**, беларускі паэт, драматург, публіцыст, перакладчык	145 гадоў	**Другая малодшая група (выхаванцы ад 3 да 4 гадоў):** Я. Купала «Лістапад» **Сярэдняя група (выхаванцы ад 4 да 5 гадоў):** Я. Купала «Лістапад» **Старшая група (выхаванцы ад 5 да 6 гадоў):** Я. Купала «Хлопчык і лётчык», «Бай»	**Вершы пра прыроду і дзяцінства:** «Хлопчык і лётчык» – пра хлопчыка, які марыў пра палёты; «Над калыскай» – пяшчотная калыханка; «Зіма» («Надышлі маразы, рэчкі закавалі...») – верш пра зімнія забавы; «Вясна» («Гэй, вясна красна...») – верш-прывітанне вясны.
5	4 жніўня 2027 года	**Янка Брыль**, беларускі пісьменнік, перакладчык	110 гадоў	**Сярэдняя група (выхаванцы ад 4 да 5 гадоў):** Я. Брыль «Жыў-быў вожык»	**Апавяданні-мініяцюры:** «Жыў-быў вожык» – гісторыя пра тое, як тата прынёс вожыка з лесу, як яго кармілі малаком, як вожык спрабаваў пасябраваць з курыцай; «Ветэрынар» – апавяданне пра сяброўства казліка і сабакі; «Ліпа і клёнік» – пра дзяўчынку Ліпу

					і сабаку, якія даглядалі маленькае дрэўца; «Усмешка» – апісваецца вясковая вуліца, па якой на бычку едзе маленькая дзяўчынка, а побач ідзе бацька.
6	23 жніўня 2027 года	**Пімен Панчанка**, беларускі паэт, перакладчык, Народны паэт Беларусі	110 гадоў	**Старшая группа** **(выхаванцы ад 5 да 6 гадоў):** П. Панчанка «Бацькаўшчына», «Месяцы года» (з верша «Родная мова»)	**Вершы:** «Радзіма» («Воблакі над рэчкай, песня над лясамі...») – патрыятычны верш, выхоўвае пачуццё павагі да Радзімы; «Лясныя дары» – верш пра восеньскія дары лесу.